# ФАБРЫКА СМЕРЦІ БРОННАЯ ГАРА

*Дарожка К.С.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г.Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Качалаў І.Л.– канд. гіст. навук, дацэнт*

Анатацыя Няма ў нашай краіне ні адной сям'і, якую не закранула б вайна. І кожны беларус з пялёнак ведае пра трагедыі Хатыні, Чырвонага Берага і Брэсцкай Крэпасці. Я б жадала звярнуць увагу на зверства фашыстаў на маёй малой радзіме - ў Бярозаўскім раёне.

Сапраўднай фабрыкай смерці ў гады акупацыі нямецка-фашысцкімі захопнікамі тэрыторыі раёна стала Бронная гара, дзе было знішчана больш за 50 тысяч савецкіх грамадзян, у асноўным яўрэйскай нацыянальнасці. У ліку расстраляных тут і жыхары Бярозаўскага раёна.

Бронная Гара - гэта найпрыгажэйшы куток Бярозаўскай зямлі, які нямецка-фашысцкімі захопнікамі быў ператвораны ў месца гібелі дзясяткаў тысяч мірных людзей. Вясной 1942 года паляна, размешчаная ў 400 м ад чыгуначнай станцыі Бронная Гара, з усіх бакоў была абнесена калючым дротам. На ўсіх падыходах да яе з'явіўся плакат на рускай і нямецкай мовах: «Асцярожна! Небяспечна для жыцця! Праходзіць далей забараняецца! Патрулі страляюць без папярэджання!» Доўгі час жыхары не маглі зразумець, чаму так узмоцнена ахоўваецца Бронная Гара. На забароненую тэрыторыю прапускалі толькі прыгнаных з навакольных вёсак жыхароў для копкі ям. Раздаваліся выбухі, уверх узляталі слупы зямлі. Многія лічылі, што немцы вядуць тут ваенна-будаўнічыя работы. Не ведалі, для чаго прызначаныя ямы, нават людзі, якія капалі іх.

У маі 1942 года на чыгуначную станцыю Бронная Гара прыбылі пяць эшалонаў з савецкімі людзьмі. Першы прыйшоў са станцыі Бяроза-Картузская. У кожным з 16 вагонаў знаходзілася не менш за 200 чалавек. Затым прыйшлі цягнікі са станцый Пінск, Кобрын, Брэст. Ад цеснаты многія паміралі ў вагонах, але трупы не прыбіраліся. Вязняў выганялі з вагонаў, прымушалі распранацца, па драцяных калідорах гналі да ямаў, загадвалі класціся радамі і расстрэльвалі. У канцы лістапада 1942 г. нямецкімі акупацыйнымі ўладамі было знішчана больш за 50 тысяч мірнага насельніцтва, у пераважнай большасці яўрэяў.

Але ні калючы дрот, ні ўзмоцненая ахова не ў стане былі схаваць страшную таямніцу Броннай Гары. Нямецкія бандыты спрабавалі схаваць злачынства, каб сысці ад адказнасці за забойствы. У сакавіку 1944 года эсэсаўцы ачапілі месца масавых забойстваў. Прыгнаным людзям загадалі разрыць магілы, а трупы спаліць. На працягу 15 дзён і начэй над Броннай гарой вісела цёмна-жоўтае воблака, стаяў невыносны смурод.

Вялізныя кучы попелу былі закапаныя ў зямлю, а ўзвышаліся магільныя пагоркі зраўнялі з зямлёй. Людзей, якія спальвалі трупы, па загадзе гестапа расстралялі, як сведак злачынстваў. Але такое жахлівае злачынства схаваць немагчыма. Надзвычайная Дзяржаўная камісія па выяўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў устанавіла, што на Броннай Гары было знішчана больш за 50 тысяч савецкіх грамадзян. Злачынцы былі ўстаноўлены пайменна.
У памяць ахвярам вайны ўстаноўлены помнікі. Іх гісторыю памятаюць і паважаюць.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1. Гіст.-дакум. хроніка Бярозаўскага р-на. – 2-е выд., перараб. и дап. – Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П.Броўкі, 2014. – С. 202-203.*